**УДК 82.091**

# ТЭМА ДВАЙНІЦТВА Ў ТВОРАХ М. ГАРЭЦКАГА І К. ГАМСУНА

***канд. філал. навук, дац. В.І. УТКЕВІЧ***
***(Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт)***
***utkevich@mail.ru***

*Праведзены супастаўляльны аналіз творчасці М. Гарэцкага і К. Гасмуна ў аспекце даследавання тэмы двайніцтва ў іх творах. Кожны мастацкі феномен з'яўляецца суперпазіцыяй індывідуальнага патэнцыялу суб'екта творчасці і сукупнасці знешніх фактараў, што ўплываюць на вынік творчага працэсу. У дачыненні да літаратурнага феномена двайніцтва сукупнасць знешніх фактараў уяўляе сабой па-мастацку асэнсаваны і эстэтычна аформлены вынік функцыянавання сістэмы такіх крыніц, як міфалагічная, філасофска-анталагічная, літаратурна-эстэтычная і сацыяльна-псіхалагічная. Такім чынам, мастацкі феномен двайніцтва насычаны шматлікімі сэнсамі, якія знаходзяць актуалізацыю ў розных анталагічных і фенаменалагічных субстанцыях. Ствараючы вобразы літаратурных герояў, М. Гарэцкі і К. Гамсун – прадстаўнікі розных нацыянальных літаратур канца XIX – пачатку XX ст, – не маглі не адчуваць трывожнага душэўнага стану сваіх сучаснікаў, абумоўленага гістарычнымі абставінамі, якія выявіўся ў тым ліку ў своеасаблівым раздваенні свядомасці. Адзначана,што найбольш яскрава гэта праявілася ў рамане "Містэрыі" К. Гамсуна і ў аповесці "Дзве душы". М. Гарэцкага.*

***Ключавыя словы****: двайніцтва, супастаўленне, дыялог, літаратурны герой, сюжэт, міфалагічна-структуральны метад, літаратурная міфатворчасць, раздвоенасць свядомасці, кропка сінгулярнасці.*

**Уводзіны**. У сучасным літаратуразнаўстве распаўсюджаны пункт гледжання, што тэма двайніцтва – набытак мастацкай літаратуры навейшага часу. Аднак нельга не пагадзіцца з заўвагай У. Г. Кароткага: "Двайніцтва – гэта запавет айчыннай гісторыі, гэта вечнасная тэма літаратуры ўсходніх славян, пачынаючы ад летапісання да твораў Новага часу (раманы і аповесці Гогаля, Дастаеўскага, Талстога, Гарэцкага, Быкава). Раздваенне заўсёды пачынаецца як двувер'е, як правіла, рэалізуецца ў тэме бацькоў і дзяцей, мінулага і сучаснасці, раздваення роду, сям'і, у канчатковым выніку – чалавека як персанажа гісторыі" [1, с. 78]. Неабходна адзначыць, што шматварыянтны дыялагічны тэкст з'яўляецца мастацкім адлюстраваннем сутнасных сацыяльна-анталагічных узаемасувязей, а ў гнасеалагічных адносінах спрыяе выяўленню глыбіннай дэтэрмінацыі не толькі паміж тымі культурнымі рэаліямі, якія належаць аднаму часу, але і тымі, якія падзелены тысячагоддзямі чалавечай гісторыі. Аналіз жа працэса эстэтычнай рэпрэзентацыі дадзенага феномена ў творах К. Гамсуна і М. Гарэцкага дазваляе паглядзець на многія творы беларускай і замежнай літаратуры з новых пазіцый, якія раскрываюць новыя абсягі для навуковага даследавання.

**Асноўная частка**. Кожны мастацкі феномен з'яўляецца суперпазіцыяй індывідуальнага патэнцыялу суб'екта творчасці і сукупнасці знешніх фактараў, што ўплываюць на вынік творчага працэсу. У дачыненні да літаратурнага феномена двайніцтва сукупнасць знешніх фактараў уяўляе сабой па-мастацку асэнсаваны і эстэтычна аформлены вынік функцыянавання сістэмы такіх крыніц, як міфалагічная, філасофска-анталагічная, літаратурна-эстэтычная і сацыяльна-псіхалагічная. Такім чынам, мастацкі феномен двайніцтва насычаны шматлікімі сэнсамі, якія знаходзяць актуалізацыю ў розных анталагічных і фенаменалагічных субстанцыях.

Філасофскі падмурак літаратурнага феномена двайніцтва складае старажытнае ўяўленне пра вобраз андрагіна як дасканалага чалавека. Як вядома, глыбокая сутнасць гэтага вобраза раскрыта ў вядомейшым дыялозе знакамітага старажытнагрэчаскага філосафа Платона "Пір". Андрагіны спалучалі ў сабе ўласцівасці абодвух чалавечых палоў, да таго ж валодалі страшэннай моцай, дзякуючы чаму замахваліся нават на ўладу багоў. Таму Зеўс разрэзаў іх напалову, і гэтыя паловы былі ўжо слабейшыя і недасканалыя. "Итак, каждый из нас – это половинка человека, рассеченного на две камбалоподобные части, и поэтому каждый ищет всегда соответствующую ему половину" [2, с. 290]. Працягваючы даследаваць філасофскія аспекты двайніцтва, спынімся на думцы Д. Чыжэўскага: "Появление двойника ставит перед человеком вопрос о конкретности его реального существования" [3, с.73]. Адпаведным чынам, феномен літаратурнага двайніцтва можна разглядаць у якасці эстэтычнага ўвасаблення экзістэнцыяльных пошукаў сучаснага чалавека, глыбокіх пошукаў асноў чалавечага быцця як такога. У межах хрысціянскай філасофіі дваістая прырода чалавека тлумачыцца яго анталагічнай прыналежнасцю да двух светаў: матэрыльнага (зямнога) і духоўнага (нябеснага).

Што датычыць уплыву такога знешняга фактара, як міфалагічны, можна сцвярджаць, што двайніцтва з'яўляецца адметнай рысай структуры твораў М. Гарэцкага і К. Гамсуна (дарэчы, як і твораў многіх іншых вялікіх і прызнаных пісьменнікаў) як своеасаблівага ўзнаўлення міфалагічнага тэксту. На наш погляд, сам эстэтычны акт шмат у чым аналагічны працэсу міфатворчасці, а мастацкі тэкст, адпа-

ведна, – аналагічны эстэтычна ўзноўленаму міфу. Безумоўна, такая аналогія яшчэ не дае падстаў для сцвярджэння іх поўнай тоеснасці. Наадварот, паміж імі існуюць дастаткова значныя адрозненні, што ў першую чаргу тлумачыцца наяўнасцю індывідуальнага аўтарскага складніка ў мастацкім творы, – напрыклад, элементаў інтэлектуальнай гульні.

Першапачаткова неабходна адзначыць, што ў творчасці К. Гамсуна міфалагічны аспект выяўлены непасрэдна ў аўтарскай літаратурнай міфатворчасці. Найбольш ярка дадзены эстэтычны феномен знайшоў сваё адэкватнае мастацкае ўвасабленне ў рамане "Плёны зямлі". Прычым у гэтым выпадку мы маем справу з міфатворчасцю ў яе найбольш экзістэнцыяльна чыстым выглядзе. Узгадаем, што сам хутар Селанро робіцца правобразам жаданай для пісьменніка новай Нарвегіі і ўзнікае нібы ніадкуль. Для яго няма ніякай гістарычнай мінуўшчыны, у яго ёсць толькі цяперашняе, дзейснае і экзістыйнае, дзякуючы таму, што яно поўнасцю скіравана ў будучыню. Кропкай адліку, энергетычным імпульсам для творчасці з'яўляецца самаадданная чалавечая праца і жаданне зрабіцца гаспадаром на сваім кавалку зямлі. Вось як апісаны першасны момант анаталагічнага пераўвасаблення неўпарадкаванага свету нарвежскім пісьменнікам у пачатковых радках рамана: "Длинная, длинная тропинка стелется по болотам и уходит в леса – кто проложил ее? Мужчина, первый попавший сюда человек. До него здесь тропинки не было. Потом, одно за другим, прошли по неясным следам на можачинах и болотах животные, и следы стали отчетливее, а там, один за другим, пронюхали о тропинке лопари и стали ходить по ней, когда им нужно было перебраться с горы на гору, чтоб проведать своих оленей. Так и образовалась тропинка через обширную пустошь, никому не принадлежащую, безхозяйную землю" [4, с. 7]. Можна меркаваць, што для Кнута Гамсуна гэта "безгаспадарчая" зямля – рэальная аснова для з'яўлення лепшай Нарвегіі. Такім чынам, мы сутыкаемся тут з бінарнымі адносінамі паміж па-за гістарычным, а, адпаведна, несапраўдным быццём роднай краіны і звышгістарычным, сапраўдным яе быццём, якое паказана ў рамане як мастацкае ўзнаўленне міфа аб "новай жаданай зямлі". Цэментуючым вобразам тут з'яўляеца вобраз Ісаака. Шэраг іншых герояў – Інгер, Аксель, Гейслер – групуюцца вакол яго, з'яўляюцца з-за яго, выступаюць як ў пэўным сэнсе двайнікі, тыя, хто з розных бакоў сцвярджаюць аўтарскую ідэю новага гаспадарання на "безгаспадарчай зямлі". Адна з прычын узнікнення двайнікоў у Гамсуна – несупадзенне ўласнай думкі героя пра самога сябе з яго вобразам. Невыяўлены бок натуры героя імкнецца сфарміраваць новы вобраз, у якім яўным зробіцца тое, што не ўсвядомлена героем, а толькі прадчуваецца ім.

У творчасці беларускага класіка Максіма Гарэцкага таксама яскрава выяўляюцца матывы пазагістарычнага быцця ў дачыненні да той рэчаіснасці, з якой ён сутыкаўся на радзіме, асабліва ў беларускіх вёсках.У першую чаргу, безумоўна, гэта было справядліва для перыяду пачатку XX стагоддзя, дакладней, часу напярэдадні рэвалюцыяйных падзей 1917 года. Асабліва ярка гэта адбілася ў аповесці "Ціхая плынь" і ў "Камароўскай хроніцы". У беларускага пісьменніка вобразаў, які знітоўваюць і падкрэсліваюць аўтарскую ідэю некалькі: Лявон Задума, Архіп Лінкевіч, Мікола Канцавы. Разам з тым, па сутнасці, – гэта ўсё адзіны вобраз у розных іпастасях: малады беларус, студэнт, які марыць таксама пра новую, другую, лепшую зямлю-краіну.

Паказаныя літаратурныя феномены, якія, на нашу думку, можна вызначыць і як прыналежныя да феномена двайніцтва, маюць глыбокае тэарэтычнае пацверджанне, напрыклад, у літаратуразнаўчых працах Ю. Лотмана. У артыкуле "Паходжанне сюжэта ў тыпалагічным асвятленні" расійскі навукоўца разглядае праблему двайніцтва ў аспекце даследавання развіцця літаратурных сюжэтаў. Міфалагічны тэкст разумеецца ім як цыклічны, а мастацкі – як лінейны. Мастацкі твор мысліцца разгортваннем міфалагічнага. У выніку гэтага "наиболее очевидным результатом линейного развертывания циклических текстов, – лічыць Ю. Лотман, – является появление персонажей-двойников" [5, с. 226]. Такім чынам, у межах дадзенай эстэтычнай канцэпцыі менавіта прешапачатковая дваістасць мастацкіх сюжэтаў вядзе да літаратурнага феномена двайніцтва.

Яшчэ адзін знакаміты расійскі навукоўца В. Тапароў, адзін з галоўных прадстаўнікоў міфалагічнаструктуральнага метаду, у артыкуле, прысвечаным раману Ф. М. Дастаеўскага "Злачынства і пакаранне", таксама закранае праблему двайніцтва і піша, што герой не перастае існаваць у прасторы рамана, нават калі перастае ўжывацца ягонае абазначэнне. "Герои Достоевского, – адзначае ён, – таким образом располагаются в некоем признаковом пространстве, где два соседних обладают рядом общих признаков, принцип же расположения зависит от функциональной установки" [6, с. 94]. Значыць, пры выкарыстанні такога літаратурнага прыёму аўтар надзяляе розных сваіх герояў адпаведна і рознымі функцыямі, аднак такая іх поліфункцыянальнасць спрыяе найбольш поўнаму раскрыццю не мноства вобразаў, а, па сутнасці, аднаго вызначальнага, важнага для самога аўтара вобраза. Можна сцвярджаць, што праз такое своеасаблівае двайніцтва шматразова ўзнаўляецца адзіны вобраз у розных экзістэнцыяльных іпастасях, і ў выніку ён набывае сваё цэласнае інтэгратыўнае ўвасабленне. Менавіта гэта адбылося з вобразам новага гаспадара ў "Плёнах зямлі" К. Гамсуна, а таксама з вобразам новага маладога беларуса ў аповесцях М. Гарэцкага.

Звернем увагу на тое, што ў беларускага пісьменніка такое інтэгратыўнае ўвасабленне адбываецца не ў межах аднаго канкрэтнага твора, але ва ўсёй творчасці; пры гэтым усё ж ёсць адна аповесць, дзе мо-

мант поліфункцыянальнасці вобраза падкрэслены асобна – “Дзве душы”. Тое, што ўсе яе героі прэзентуюць розныя бакі аднаго, па сутнасці, вобраза, пацвярджае нават гукавое падабенства прозвішчаў: Гаршчок, Гарэлік, Гарэшка, Гальшанскі. І калі Абдзіраловіч гаворыць з кім-небудь з іх, намагаецца зразумець яго пазіцыю, той нібы робіцца ягоным двайнікам, а сам Абдзіраловіч у гэты момант адчувае і разумее яго як сябе. Недавер да новых ідэалаў і бясконцыя сумненні Ігната Абдзіраловіча былі надзвычайна сугучнымі свайму часу. М. Гарэцкі – мастак, які паказаў увесь жах разарванасці, раздвоенасці чалавечай свядомасці ў эпоху “вавілона ідэй”, у часы цесна пераплеценых сацыяльных і духоўных супярэчнасцяў, якімі былі для Беларусі першыя гады савецкай улады. Гарэцкі нібы здзіўляецца ўнікальнай здольнасці чалавека пры пэўных гістарычных умовах сумясціць у сабе несумяшчальнае: хрысціянскую пакорлівасць, захапленне камуністычнымі ідэямі, шчырае спачуванне беларушчыне. Гарэцкі адлюстраваў трагедыю чалавека на зломе эпох, чалавека, які страціў сваю анталагічную цэласнасць, які цяжка перажывае і ўсведамляе сваю адзіноту ў барацьбе з сіламі ўнутры сябе. Пісьменнік з вялікай мастацкай сілай паказаў раздваенне свядомасці чалавека сваёй эпохі.

У адрозненне ад міфалагічнага аспекта, у псіхалагічных адносінах літаратурнае двайніцтва праяўляецца ў першую чаргу праз апісанне канкрэтных характараў. Псіхалагічны падмурак літаратурнага феномена двайніцтва прадстаўлены псіхалагічнымі матывіроўкамі з’яўлення ў героя двайніка, прычым сацыяльным падтэкстам традыцыі двайніцтва ў літаратуры з’яўляецца праблема экзістэнцыяльнай адчужанасці людзей, іх ізаляванасці адзін ад аднога, так званай атамізацыі грамадства. Такім чыным, адзначым, што літаратурнае двайніцтва дэтэрмінавана не чыста псіхалагічнымі, а хутчэй сацыяльна-псіхалагічнымі фактарамі.

Падкрэслім, што атамізацыя грамадства як не што іншае спрыяе развіццю псіхалагічнага феномена раздваення свядомасці. Абставіны сучаснага жыцця сталі прадметам працяглага і складанага роздуму Кнута Гамсуна, які прыйшоў да высновы, што сама сацыяльная рэчаіснасць вымагае радыкальных змен у літаратурным працэсе. Свае эстэтычная погляды нарвежскі пісьменнік дастаткова падрабязна выклаў у прачытанай ім публічнай лекцыі ”Псіхалагічная літаратура”. “Раз уж современный человек…полноценный, с тонкой психологической организацией, – соткан из массы разных элементов, связь между которыми трудно проследить, – падкрэсліваў ён, – и стал существом, которое никоим образом не может быть суммой каких-либо качеств или обозначаться одной-двумя какими-то чертами, – раз уж человек стал таким, психологическая литература в наши дни еще в меньшей степени может оставаться такой же, как в эпоху Шекспира” [7, с. 328].

Такім чынам, на думку Гамсуна, сучасны яму чалавек менавіта ў псіхалагічных адносінах зрабіўся больш складаным, чым яго продкі. Звернем увагу на тое, што пісьменнік не дае аксіялагічнай адзнакі гэтаму працэсу, ён проста канстатуе факт: невядома, зрабіліся людзі больш дасканалымі ці менш – яны проста зрабіліся іншымі, і на гэта паўплывала развіццё еўрапейскай цывілізацыі наогул і літаратуры ў прыватнасці. Адпаведна, на думку нарвежскага класіка, у літаратурных творах павінна адлюстроўвацца ўся складаная чалавечая прырода, уся дыялектычная супрацьлегласць чалавечай душы. “Противоречия” в человеческой натуре, – працягвае К. Гамсун, – представляются мне поэтому само собой разумеющимися, и я мечтаю о литературе, где герои в буквальном смысле слова непоследовательны, где непоследовательность не единственная, не подавляющая, но очень четкая и решающая черта” [7, с. 337].

Гаворачы пра асаблівасці эстэтыкі Гамсуна, можна сцвярджаць, што яе неад’емны элемент – прызнанне пісьменнікам сваёй эпохі часам глыбокагй грамадскай, маральнай, эстэтычнай дысгармоніі, якую чалавек з імкненнем да цэласці павінен выправіць. Адзначым, што праз усю творчасць К. Гамсуна, асабліва праз ягоныя артыкулы і эсэ праходзіць вобраз Расіі (напрыклад, дарожныя нататкі “У казачнай краіне”), адчуваецца ўнутраны дыялог з Дастаеўскім, спасылкі на яго ідэі і канцэпцыю творчасці, мастацкую і філасофскую праблематыку яго раманаў. Водгулле “чужога” ў “сваім”, раздваенне голасу, адлюстраванне першаснага ў другасным, “Я” героя ў сістэме персанажаў, праблема ідэнтычнасці і канстантнасці ўласцівасцей, прысваенне чужых і адчужэнне ўласных – вось прадмет аналізу гамсунаўскага рамана “Містэрыі”.

Эсэістычны стыль, якім адрозніваецца раман К. Гамсуна”Містэрыі”, шмат у чым выкліканы да жыцця алюзіямі на творы Дастаеўскага. Ён вымагае шматслойнасці, паліфанічнасці, шматварыянтнасці, нявызначанасці і нават асаблівай нясконачанасці тэксту. Для чытача так і застаецца невядомым: ці сапраўдным імем прадставіўся Нагель, чым ён займаўся раней, дзе жыў, ці знарок прыехаў у горад, дзе трагічна скончыў жыццё. Аўтар нібы робіцца ўсяго толькі назіральнікам, які знаходзіцца па-за тэкстам, які праводзіць эксперымент, які сам толькі і робіць, што ставіць пытанні. Хутчэй за ўсё гэта робіцца аўтарам згодна з эстэтычным законам літаратурнага тэксту, заўважанага М. Бахціным: “Эта вненаходимость… позволяет художественной активности извне объединять, оформлять и завершать событие. Изнутри самого познания и самого поступка это объединение и завершение принципиально невозможны: ни действительность познания не может, оставаясь верной себе, объединиться с долженствованием, ни долженствование, сохраняя свое своеобразие, объединиться с действительностью – нужна существенная ценностная позиция вне познающего и вне долженствующего и поступающего сознания, находясь на которой можно было бы совершить это объединение и завершение” [8, с. 33].

У рамане "Містэрыі" таксама няма відавочных двайнікоў. Але ў адпаведнасці з пастаўленымі мастацкімі задачамі пісьменнік стварае вельмі празрыстыя двайніцкія лініі: Юхан Нагель – жабрак Хвілінка, Дагні Х'елан – Марта Гудэ, а таксама люструюць адносіны Нагель – Дагні, Хвілінка – Марта, а затым і Нагель – Марта, Хвілінка – Дагні. Для раскрыцця літаратурнага характару ў К. Гамсуна вобраз Нагеля важны тым, што субстанцыя духу існуе ў ім амаль без цела, бо спосаб стварэння асобы – ягоныя містэрыі, уяўленні, узнёслыя маналогі. І ў гэтым – кантраст з Хвілінкай, чый вобраз насычаны натуралістычнымі падрабязнасцямі: заношанае адзенне, выпадзенне валасоў. Тонкі стан душы Нагеля і ягоная магчымасць падманваць і рабіць злыя учынкі, непрывабны знешні выгляд Хвілінкі і магчымасць быць вялікадушным, шчырым, дапамагаць – гэта ўсё, па сутнасці, межы магчымага і рысы аднаго чалавека. Гэта пацвярджаюць словы, з якімі Нагель звяртаецца да Хвілінкі: "Здесь в городе вы – единственный человек, который всегда вызывает у меня интерес, единственный, с кем мне хочется общаться. Так вас, значит, зовут Юханнес? Мой дорогой друг, это я знал давно, задолго до вчерашнего вечера, когда мне случайно назвали ваше имя…" [9, с. 367]. Або: "Я хочу сорвать с вас маску и довести вас до того, чтобы вы обнаужили свою истинную сущность, кровь стынет в моих жилах от отвращения всякий раз, когда я вижу ваши лживые голубые глаза, я съеживаюсь в вашем присутствии и знаю только одно: вы по натуре преатель. Даже в эту минуту мне кажется, что вы втихомолку потешаетесь надо мной, что, несмотря на ваш сокрушенный вид, на это отчаяние, написанное на вашем лице, вы в глубине души заливаетесь свинским, хрюкающим смехом над моим бессилием обличить вас, поскольку у меня нет никаких улик" [9, с. 433]. Двайнік часта ў мастацкім творы робіць тое, што герой мог бы зрабіць, але ніколі не зробіць. Праблема суіснавання героя і двайніка, іх узаемасувязь і ўзаемадзеянне, пастаяннае пачуццё віны і адказнасць героя за ўчынкі двайніка: адказнасць Нагеля за абяцанкі паверанага падарыць новы касцюм Хвілінцы, абяцанне жаніха Дагні падарыць цёплыя фуфайкі, або ў Гарэцкага – адказнасць Абдзіраловіча за ўчынкі кожнага беларуса, сустрэтага ім ў жыцці – важнейшы складнік мастацкай канцэпцыі аўтараў.

Можна сцвярджаць, што і М. Гарэцкі таксама разглядае феномен двайніцтва ў псіхалагічным плане. Раздваенне асобы паказана ў яго творах з аналітычнага пункту гледжання: пісьменнік імкнуўся раскрыць суб'ектыўную прыроду адчужанасці асобы ад сябе самой. Безумоўна, хоць дваістасць анталагічна і іманентна належыць усёй чалавечай прыродзе і, адпаведна, усёй чалавечай культуры ў кожны канкрэтна-гістарычны момант, аднак больш за усё яна знаходзіць сваё рэальнае ўвасабленне ў літаратуры ў пераломныя моманты жыцця народа, што, як правіла, абумоўлена станам агульнай сацыяльный няўстойлівасці, крызісам сацыяльна-палітычнага і эканамічнага развіцця грамадства, стратай традыцыйнага тыпу светапогляду і светаадчування. Адным з такіх пераломных момантаў была мяжа XIX–XX стагоддзяў, затым Першая сусветная вайна, а крыху пазней – Рэвалюцыя 1917 года, Грамадзянская вайна ў Расіі. Беларускія землі ўваходзілі тады ў склад Расійскай імперыі, і беларуская культура з-за розных аб'ектыўных прычын ва многіх адносінах апынулася менавіта на гэткім сацыяльна-палітычным, светапоглядавым і мастацка-эстэтычным зломе. Ва ўжо прыгаданай аповесці "Дзве душы", звяртаючыся да падзей Грамадзянскай вайны, М. Гарэцкі піша аб перажываннях галоўнага героя Ігната Абдзіраловіча наступнае: "Душа двоілася. Адна палова несказанна плакала і жалілася на другую, што яна мучыць яе падманкамі" [10, с. 164]. "Так, свой ці чужы, – падумаў ён з нейкім сорамам ці каяннем. – Я не ведаю, хто мне свой і хто чужы. Я дзяржуся дзікога нейтралітэту і ашукваю тых і гэтых і самога сябе. Няўжо панская кроў, каторая цячэць у маіх жылах, маець тут нейкае значэнне?" [10, с. 194]. Падагульняючы, можна сказаць, што індустрыялізацыя, новыя навуковыя адкрыцці, палітычная барацьба, прадчуванне сацыяльных катастроф спарадзілі свайго кшталту памежны светапогляд, для якога характэрна ўскладненне сувязей чалавека з навакольным светам. Усё гэта не магло не паўплываць на змяненне свядомасці чалавека дадзенага перыяду, ён страчвае ўнутраную цэласнасць.

Літаратурна-эстэтычны аспект двайніцтва герояў, характараў выяўляецца ў тым, што, на нашу думку, можна вобразна пазначыць як своеасаблівы "вузел". Гэты "вузел" – не проста мастацкі вобраз, але і асаблівая сінгулярная кропка, дзе адбываецца сустрэча дзвюх розных іпастасей літаратурнага героя. У гэтай кропцы эстэтычная прастора мастацкага твора настолькі сціскаецца, што робіцца немагчымым іх суіснаванне. Зразумела, спалучэннне "нулявая кропка твора" трэба разумець выключна ў эстэтычным сэнсе. У межах сюжэтнага развіцця падзей сінгулярнай кропкай сустрэчы двайнікоў можа стаць іншы герой, канкрэтныя абставіны і нават знаходжанне на роднай зямлі, якая ёсць той прасторава-часавы кантынуум быцця, куды ўкаранёны літаратурны герой, з якім неад'емна ўзаемазвязаны праз сілавое поле аўтарскай думкі. Акрамя таго, можа змяняцца характар героя цалкам, аднак могуць змяняцца і асобныя іпастасі. Адна з іх, напрыклад, можа перайсці з актуальнага стану ў патэнцыяльны, бо аказваецца звязанай гэтым самым "вузлом". "Узел, – адзначае вядомы даследчык міфалагічнай сімволікі М. Макоўскі, – считался в древности магическим символом: посредством узла можно было "связать" как добро, здоровье и счастье (т.е. нанести им вред), так и зло (избавление от болезней, страданий)" [11, с. 334].

Такім чынам, кропка сінгулярнасці непазбежна разбурае двайніцтва, і адзіным магчымым вынікам сустрэчы ў "вузле" з'яўляецца радыкальнае перараджэнне характара літаратурнага героя. Цікава, што канчатковы вынік дадзенай сустрэчы не абавязкова павінен быць дэтэрмінаваны ўсёй логікай мастацкага твора, часам гэта можа адбывацца і насуперак ёй. Двайніцтва – гэта спецыфічная хвароба літаратурнага героя, сутнасць якой заключана ў страце ім унутранай гармоніі. Як следства, звязванне адной іпастасі

можна прывесці як да папраўкі, так і да згубы, часам проста да фізічнага знішчэння. Прыкладам апошняга можа быць лёс галоўнага героя рамана кнута Гамсуна "Містэрыі" Юхана Нагеля, які скончыў жыццё самагубствам. Наадварот, зусім іншы вынік уздзеяння сінгулярнай кропкі на героя прыведзены ў аповесці М. Гарэцкага "Меланхолія". У якасці такой кропкі ў беларускага пісьменніка выступае родная зямля – малая радзіма, бацькоўская хата галоўнага героя Лявона Задумы. Менавіта пасля наведвання роднай вёскі, на родных могілках ён адчуў унутранае перараджэнне: "І ішоў усё шыбчэй і шыбчэй, шаптаў сам сабе словы радасці і ўцехі, чуў сябе моцным і адважным, хацеў ляцець…Надумаўся ўзяцца за сялянскую працу, працаваць да поту, гаварыць з людзьмі, казаць ім аб вызваленні і лепшым жыцці, усведамляць іх…Адпачнуўшы троху ў бацькі, паехаць зноў у свет, на сваю працу, а там ужо будзе відаць што і як…" [12, с. 114].

**Заключэнне**. Аналіз працэсу станаўлення беларускай літаратуры дазваляе зрабіць выснову, што прысутнасць у творах беларускіх аўтараў матываў двайніцтва шмат у чым абумоўлена спецыфікай дадзенага працэсу. Стратэгія самаідэнтыфікацыі айчыннай літаратуры мае якраз дыялагічны характар. Беларускі літаратуразнаўца Ж.В. Некрашэвіч-Кароткая, каментуючы адказ Святланы Алексіевіч ("Мая радзіма – гэта думка"), выказаны Нобелеўскай лаўрэаткай ў адным з інтэрв'ю, адзначае: "…именно в таком ответе я вижу продолжение традиции нашей национальной литературы с ее глубочайшим интеллектуализмом, с ее вниманием к человеческой мысли, к обмену мнениями, к диалогу – будь то по Сократу или по Бахтину. Доминирование именно такой стратегии самоидентификации символизирует иллюстрация в книге Яна Барщевского "Шляхтич Завальня", где люди самого разного происхождения и, возможно, самых разных национальностей собрались на традиционные белорусские "вечарніцы" [13, с. 138]. Менавіта такая літаратуразнаўчая парадыгма, на наш погляд, дазволіць надаць новы метадалагічны імпульс даследаванню тэмы двайніцтва ў беларускай літаратуры.

ЛІТАРАТУРА


1. Кароткі, У. Г. Феномен двайніцтва ў старажытнай літаратуры ўсходніх славян / У. Г. Кароткі // Беларуская літаратура і гісторыя ; навук. рэд. Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая. – Мінск: БДУ, 2013. – С. 78–82.
2. Платон Пир / Платон // Сочинения. – М., 2011. – С. 236–385.
3. Чижевский, Д. И. К проблеме двойника / Д. И. Чижевский // Вокруг Достоевского : сб. ст. : в 2 т. – М. : Русский путь, 2007 – Т. 1. – С. 54–73.
4. Гамсун, К. Плоды земли / К. Гамсун // Собр. соч. : в 6 т. – М. : Худож. лит., 1996. – Т. 4. – С. 7–332.
5. Лотман, Ю. М. Происхождение сюжета в типологическом освещении / Ю. М. Лотман // Избранные статьи : в 3 т. – Таллин, 1992. – Т. 1. – С. 225–243.
6. Топоров, В. Н. Поэтика Достоевского и архаичные схемы мифологического мышления («Преступление и наказание») / В. Н. Топоров // Проблемы поэтики и истории литературы. – Саранск, 1973. – С. 90–112.
7. Гамсун, К. Психологическая литература / К. Гамсун // В сказочном царстве. Путевые заметки. Статьи. Письма : сб. – М. : Радуга, 1993. – С. 325–342.
8. Бахтин, М. М. Проблема содержания, материала и формы в словесном художественнм творчестве / М. М. Бахтин // Вопросы литературы и эстетики. Исследования разных лет. – М. : Худож. лит., 1975. – С. 6–72.
9. Гамсун, К. Мистерии / К. Гамсун // Собр. соч. : в 6 т. – М. : Худож. лит., 1991. – Т. 1. – С. 183–454.
10. Гарэцкі, М. Дзве душы / М. Гарэцкі // Выбраныя творы. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – С. 147–243.
11. Маковский, М. М. Сравнительный словарь мифологической символики в индоевропейских языках: Образ мира и миры образов / М. М. Маковский. – М., 1996, – 416 с.
12. Гарэцкі, М. Меланхолія / М. Гарэцкі // Збор твораў : у 4 т. – Мінск : Маст. літ., 1985. – Т 2. – С. 53–123.
13. Некрашевич-Короткая, Ж. В. Литературоведение как провокация истории литературы: восточнославянский научный дискурс на рубеже веков / Ж. В. Некрашевич-Короткая // Русская и белорусская литературы на рубеже XX–XXI веков : сб. науч. ст. – Минск : РИВШ, 2014. – С. 131—38.


*Пастуніў 25.11.2015*

**THE THEME OF DUALITY IN WRITING WORKS OF M. GARETSKI AND K. HAMSUN**

***V. UTKEVICH***

*The present article is dedicated to comparative analysis of creativity M. Garetsky and K. Hamsun in aspect of the research theme of duality in their writing works. Each artistic phenomenon is the superposition of individual creativity and potential of the subject combination of external factors influencing the result of a creative process. With regard to the literary phenomenon of duality set of external factors is the artistic and aesthetic design of a meaningful result of the system of sources such as a mythological, philosophical and ontological, aesthetic, social and psychological. Thus, the artistic phenomenon of duality is saturated with many meanings that are updating in different ontological and phenomenological substances. Creating images of literary heroes, M. Garetsky and K. Hamsun – representatives from various national literatures of the late XIX – early XX century, could not help but feel anxious state of mind of his contemporaries due to historical circumstances that emerged, including in a kind of split consciousness. According to the author, most clearly manifested in the novel "The Mysteries" by K. Hamsun and in the story "The Two Souls" by M. Garetsky.*

***Keywords:*** *duality, comparison, dialogue, literary character, plot, mythologically-structural method, a literary myth, duality consciousness, singularity point.*